# Студэнцтва і прафсаюз разам

**У Мінску падзячнымі лістамі ўзнагародзілі прафактывістаў — выпускнікоў УВА з усёй краіны.**

У Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі падзячнымі лістамі ўзнагародзілі больш за 70 чалавек — самых ініцыятыўных актывістаў Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Мерапрыемства ўпершыню прайшло на рэспубліканскім узроўні: у сталіцу з'ехаліся актывісты з усёй Беларусі. Гэта тыя, хто ўнёс значны ўклад у развіццё студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі, абараняў сацыяльна-эканамічныя правы студэнтаў.

— Хачу пажадаць усім выпускнікам развіцця ў прафесійным і духоўным плане, а таксама дасягнення пастаўленых мэт. Наша дзяржава ўдзяляе вялікую ўвагу моладзі і робіць усё для таго, каб кожны з вас абавязкова быў запатрабаваны і паспяховы ў сваёй краіне, — адзначыла ў сваім віншаванні старшыня галіновага прафсаюза Таццяна Якубовіч.

Па яе словах, сёння такія ўрачыстыя мерапрыемствы набываюць асаблівы сэнс. Беларусь апынулася на перадавой палітычных, эканамічных і інфармацыйных войнаў, бесперапынных спроб скажэння гісторыі, таму вельмі важна захаваць мір і згоду ў грамадстве. Таццяна Якубовіч падкрэсліла, што члены прафсаюза не могуць быць абыякавымі да гэтага.

> Прафсаюз — гэта тая структура, якая заўсёды дапаможа.

Свята маладосці, добрых спраў і светлых надзей — так казалі пра мерапрыемства яго ўдзельнікі. Яны ахвотна дзяліліся адно з адным вопытам прафсаюзнай работы, планамі на будучыню. Дарэчы, каля трэці членаў галіновага прафсаюза — ва ўзросце да 35 гадоў. Самыя цікавыя сацыяльныя праекты моладзі аб'яднанне падтрымлівае матэрыяльна — на іх рэалізацыю выдзяляюцца фінансавыя сродкі.

Падчас вучобы напрамак дзейнасці прафактывістаў быў розны: хтосьці ўдзельнічаў у культурна-масавай і грамадскай рабоце, хтосьці — у спартыўных мерапрыемствах. Некаторыя атрымлівалі стыпендыю ФПБ і галіновага прафсаюза.

На ганаровае ўзнагароджанне сабраліся выпускнікі тэхнічных, гуманітарных, творчых спецыяльнасцей. Ангеліна Турло скончыла Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, дзе ў тым ліку праявіла сябе ў прафсаюзнай дзейнасці. Яна прызналася, што развітацца з УВА не збіраецца — плануе застацца тут працаваць у навуковай лабараторыі, а таксама будзе выкладаць:

— З трэцяга курса я была старшынёй цэхавай прафсаюзнай арганізацыі на сваім факультэце. Дзякуючы прафсаюзу, маё студэнцкае жыццё было насычана цікавымі падзеямі. У асноўным мы займаліся правядзеннем культурных мерапрыемстваў. Прафсаюз дае выдатную магчымасць праявіць сябе.

Выпускнік Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Максім Свірскі ў актыўную прафсаюзную дзейнасць уключыўся з першага курса. Дарос да старшыні цэхавай прафсаюзнай арганізацыі інжынернага факультэта.

— Мы арганізавалі безліч мерапрыемстваў інфармацыйнага, культурна-масавага характару, — расказаў Максім. — Акцэнт рабілі на сацыяльнай падтрымцы студэнтаў. Напрыклад, па маёй ініцыятыве ва ўніверсітэце праходзіў дзень спантаннай дабрыні. Першакурснікам хачу сказаць: не сумнявайцеся, прафсаюз — гэта тая структура, якая заўсёды дапаможа.

Арганізатары мерапрыемства пажадалі моладзі лёгкага і плённага прафесійнага шляху, а таксама ніколі не страчваць светлага імкнення працаваць на карысць людзей.

**Лізавета МІЦКЕВІЧ.**